2. Адкуль маглі паходзіць гэтыя “белыя русы”? (пра гэта ўскосна гавораць імёны братоў, а таксама ўзгадванне іх у крыніцы разам з “палякамі”)

3. Якое яны мелі сацыяльнае паходжанне? (падказку на гэты конт можа даць указанне ў крыніцы на іх “прафесію”)

4. Калі, як і чаму яны апынуліся ў Дорпаце?

5. Чаму ва ўмовах вайны паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай яны вырашылі перайсці на “варожы” бок і застацца ў захопленым шведамі горадзе?

Усе гэтыя пытанні, як можна заўважыць, цесна звязаныя паміж сабой. Нам уяўляецца, што адказы на іх дапамогуць акрэсліць тэрытарыяльны арэал распаўсюджвання носьбітаў этнахароніма “белы рус” у пачатку XVII ст. Цікавым дадзенае даследаванне ўяўляецца таксама з пункту гледжання працэсаў фарміравання мадэрных нацый у Еўропе, якія распачаліся як раз у ранні Новы час. Асабліва слушнай гэтая заўвага з’яўляецца з улікам кантэксту, г. зн. вайны паміж Швецыяй і Рэччу Паспалітай, якая ахапіла ў тыя часы Усходнюю Прыбалтыку. Вядома, што войны, як ніякія іншыя гістарычныя з’явы, у даволі катэгарычнай форме размяжоўваюць “сваіх” і “чужых”, актуалізуючы ў тым ліку “нацыянальную” самасвядомасць. Да таго ж гэты рэгіён прыцягвае ўвагу як тэрыторыя, дзе адбываліся цесныя міжэтнічныя кантакты: там сустракаліся шведы, немцы, палякі, літоўцы, рускія. Цікава даведацца, якое месца займалі ў той час “белыя русы” сярод названых супольнасцяў.

Дакумент, які мы прэзентавалі ў дадзеным дакладзе, падаецца цікавым у кантэксце штудыяў па айчыннай гісторыі. Каб падтрымаць даследчую інтрыгу, мы возьмем на сябе смеласць выказаць здагадку, што гэтая крыніца можа быць пастаўленая ў адзін шэраг з “працоўным кантрактам” паміж русінамі і курляндскім герцагам, заключаным у 1666 г. [2; 3]. У такім выпадку, мы маглі б сцвярджаць аб наяўнасці пэўнай сістэмы “працоўнай міграцыі” з тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, а менавіта яго паўночных зямель – Полацкага ці Віцебскага ваяводстваў, – на тэрыторыю Усходняй Прыбалтыцы ў бурлівыя часы шматлікіх ваенных сутыкненняў у гэтым рэгіёне ў другой палове XVI – XVII стст. Так ці інакш, адказы на пастаўленыя пытанні выходзяць за межы дадзенага даклада. Мы спадзяемся, што яны знойдуць адлюстраванне ў асобным артыкуле.

1. Белы, А. Хроніка Белай Русі: Імагалогія Беларусі XII–XVIII стст. / А. Белы. – 2-е выд., папраўл. і дапоўн. – Смаленск : Інбелкульт, 2013. – 468 с.
2. Евстратьев, О. И. «Rusacy» в Норвегии? К проблеме критики одного «трудового контракта» XVII века / О. И. Евстратьев // «Актуальные проблемы источниковедения: к 420-летию дарования городу Витебску магдебургского права» : материалы IV Междунар. научно-практ. конф., Витебск, 20–21 апреля 2017 г. / ВГУ имени П. М. Машерова ; под ред. А. Н. Дулова [и др.]. – Витебск, 2017. – С. 166–168.
3. Евстратьев, О. И. «Обещаем ехать в Норвегию»: сведения одного трудового контракта о территориальной мобильности «русаков» в XVII в. / О. И. Евстратьев // Studia Historica Europae Orientalis = Исследования по истории Восточной Европы : науч. сб. / РИВШ ; ред. кол.: А. В. Мартынюк (отв. ред.) [и др.]. – Минск, 2017. – Вып. 10. – С. 127–148.
4. Мартынюк, А. В. Кто и когда впервые произнес на латыни и по-немецки «Белая Русь»? / А. В. Мартынюк // Alba Ruscia: белорусские земли на перекрестке культур и цивилизаций (X–XVI вв.) ; под ред. А. В. Мартынюка. – Москва : Квадрига, 2015. – С. 27–38.
5. Eesti Ajalooarhiiv (EAA). – F. 995. Nim. 2. S. 453.

Сцебурака А.М.

“СТАН КАРАЛЕЎСКІХ ДВАРОЎ ЕЎРОПЫ”, АБО ШТО ВЕДАЛІ ФРАНЦУЗЫ АБ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У КАНЦЫ XVII СТ.

Пад час адкрыцця XXVI Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу 6 лютага 2019 г. адбылася ўрачыстая перадача рэдкіх выданняў і рукапісаў з прыватнай калекцыі У.А. Ліхадзедава ў фонд Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. У рамках дзяжаўна-прыватнага партнёрства рэалізуецца сумесны праект НББ і лаўрэата Прэміі «За духоўнае адраджэнне» У.А. Ліхадзедава. Ён прадугледжвае супольную працу па пошуку, вывучэнні, вяртанні ў дзяржаўныя зборы і папулярызацыі дакументальнай спадчыны Беларусі [4].

Сумесны праект прадугледжвае паступовую перадачу ўнікальнай прыватнай калекцыі дакументальных помнікаў У.А. Ліхадзедава, якая складае каля 100 тыс. адзінак захавання, у зборы НББ са стварэннем «Фонду Уладзіміра Ліхадзедава». У гэтым фондзе прадугледжваецца

Репозиторий ВГУ

фарміраванне калекцыі рэдкіх выданняў XVI–XX ст. шляхам дарэння, часовага захавання, набыцця. Рарытэты з «Фонду У. Ліхадзедава» будуць даступныя для чытачоў Бібліятэкі і будуць выкарыстоўвацца для арганізацыі выставаў, навуковых, адукацыйных і выдавецкіх праектаў.

Сярод іх кірылічныя і заходнееўрапейскія старадрукі беларускай тэматыкі, картаграфічныя матэрыялы, "спавядальныя ведамасці" і "шлюбныя вобшукі" праваслаўнай царквы XIX ст., дакументы аб шляхецкім паходжанні, рукапіс беларускіх татар, арыгінальны прывілей Жыгімонта III Вазы пачатку XVII ст. на старабеларускай мове з калекцыі Тышкевіча, полацкі дакумент XVI ст., падшыўку Гродзенскіх губерскіх ведамасцей 1840-х гг. і інш. Гэтыя кнігі, часопісы, архіўныя матэрыялы з'яўляюцца важкім дадаткам да калекцыі асноўнага кнігазбору краіны і маюць значны патэнцыял у гісторыкаў і краязнаўцаў. Аб адным з цікавых экзэмпляраў рэдкага старадруку з "Фонду У. Ліхадзедава" пойдзе размова ў гэтым артыкуле.

Заўжды цікава даведацца пра тое, што думаюць пра тваю краіну суседзі, што пра яе ведаюць у свеце. Сёння, дзякуючы сучасным камунікацыям недахопу інфармацыі такога кшталту няма. Але зусім іначай справы выглядалі ў XVII ст., калі для цікаўнага еўрапейца беларускія абшары былі далёкімі і таямнічымі і існавала ня так шмат крыніц звестак пра тое, што адбываецца ў нас.

П'ер Гошэ дэ Сэнт-Март (Pierre Gaucher de Sainte-Marthe) прадстаўнік дынастыі прыдворных гістарыёграфаў французскага караля. У яго родзе быў вядомы паэт і эрудыт Сцэвола I дэ Сэнт-Март (Scévole I^{e} Sainte-Marthe (1536 – 1623)), аўтар твораў на лацінскай і французскай мовах (у тым ліку аўтар кнігі "Слёзы ў памяць аб хрысціянскім каралі Францыі і Польшчы"(1590 г.), прысвечаны Генрыху Валуа). Бадай самым вядомым гісторыкам з іх дынастыі быў бацька П'ера Сцэвола дэ Сэнт-Март (Scévole de Sainte-Marthe (1571–1650)), які разам са сваім братам-блізнятам Луі стварыў надзвычай папулярную "Генеалагічную гісторыю Французскага дому".

Пазней П'еру перашлі рукапісы бацькі і ён выдаў у 1668 г. яшчэ адну грунтоўную працу аб родзе ўплывовых французскіх магнатаў "Генеалагічную гісторыю дому Трэмойль" [1].

Сярод тузіна арыгінальных твораў П'ера ёсць некалькі сапраўды цікавых выданняў, якія былі прысвечаны апісанню палітычнай сітуацыі ў Еўропе ў XVII ст. Прапаноўваю засяродзіцца на адным з іх – кнізе "Стан каралеўскіх двароў Еўропы", дзе ў другой частцы вядзецца пра Англію, Данію, Швецыю, Польшчу і Масковію [2]. Структура апісанняў усіх дзяржаў у кнізе стэрэатыпная: манарх і яго сям'я, парламент і мясцовая адміністрацыя з пралікам прозвішчаў і, часта, датамі прызначэння ці абрання.

Французскі гістарыёграф караля, а менавіта так ён сябе вызначае на тытульным аркушы, не стамляе чытача назвай Рэч Паспалітая, а звыкла карыстаецца вызначэннем "Польшча", каб апісаць федэратыўную дзяржаву абодвух народаў. Адзінай ілюстрацыяй да раздзелу ёсць выява гербу тагачаснага манарха Сабескага па-майстэрску выкананы ў выглядзе якаснай мініяцюрнай гравюры. Дакладней, на гербе Рэчы Паспалітай у цэнтры змешчаны тарч з кляйнотам Сабескіх. Герб ВКЛ апісваецца тут наступным чынам: *"Срэбны ўзброены коннік, які трымае ў правай руцэ меч высока над сабой, а ў левай блакітны шчыт, упрыгожаны залатым патрыяршым крыжам, конь закаваны ў блакітныя латы і мае залатыя падковы, з'яўляецца Літоўскім* [гербам]" [2, с. 542]. (Адметна, што тут крыж з Пагоні класіфікуецца як "патрыяршы", хаця даволі часта аналагічную канфігурацыю ўкрыжавання называюць у Францыі "латарынгскай").

Пазнаёмімся з апісаннем нашага краю ў тую складаную для нас часіну. Без перабольшання, 1640–60 гг. можна лічыць горшым часам выпрабаванняў, калі з-за шэрагу войнаў нашыя абшары прыйшлі ў нечуваны заняпад, а насельніцтва зменшылася на палову. Дэмаграфічны і эканамічны абвал суправаджаўся палітычнай нестабільнасцю, калі досыць часта змяняліся манархі, а ўсемагутныя магнаты змагаліся паміж сабой за ўладу і ўплыў у дзяржаве. Адметнасць нашай крыніцы інфармацыі ў часе яе стварэння і яе паходжанні: зірнем на наш край вачыма французскага навукоўца другой паловы XVII ст. Яго кніга выйшла ў 1680 г., адпаведна ў ёй разглядаюцца рэаліі і асобы пераважна 1660–70 гг. "*Гэта каралеўства вылучае тры станы: першае – духавенства, другое шляхецкае і апошняе – трэцяе саслоўе, якое ўключае ўсіх тых, хто не мае прывілеяў і займаецца сваймі заняткамі*"… Кніга выйшла ў час каралявання ў Рэчы Паспалітай Яна III Сабескага (1676–1696). Але аўтар пералічыў двух папярэднікаў караля – Міхаіла Карыбут-Вішнявецкага "*выхадца з найстаражытнейшага дваранства Русі*" і Яна II

Репозиторий ВГУ

Казіміра Вазу, які добраахвотна пакінуў трон у 1668 г. і праз чатыры гады памёр у Францыі ў якасці кіраўніка самага старога абацтва Парыжа – Сен-Жэрмэн-дэ-Прэ. Аўтара вабяць дынастычныя сувязі і рухаючыся ў гэтым кірунку ён разблытвае хітраспляценні шлюбных стасункаў былога караля Міхаіла Карыбут-Вішнявецкага (1669–1673). Яго жонка Элеанора Марыя Аўтрыйская, сястра Леапольда I Габсбурга, пасля смерці першага мужа зноў пабралася шлюбам з Карлам V і стала княгіняй Латарынгіі (на той час рэгіён яшчэ не ўваходзіў у Французскае каралеўства, але відавочна вельмі цікавіў аўтара кнігі і парыжскую палітычную эліту).

На момант публікацыі кнігі "L'Estat de la cour des roys de l'Europe" каралём безумоўна з'яўляўся Ян III Сабескі, чыёй жонкай была француженка Марыя Казіміра Луіза дэ Ла Гранж д'Арк'ен, удава ваяводы Яна Замойскага. Гістарыёграф, відаць, каб падкрэсліць сувязь караля Рэчы Паспалітай з французскай зямлёй аж на паўстаронкі расцягвае апісанне тытулатуры далёка не самага багатага і высакароднага бацькі Марысенькі – маркіза Анры Альберта дэ Ла Гранж д'Арк'ен (1613–1707). Адметна, што француженка-жонка Сабескага мела з ім у шлюбе чатырнаццаць дзяцей, а сам хаўрус быў, відаць па ўсім, заключаным па каханні, што было не частай з'явай для манаршых вяселляў тае пары. У кнізе цытуюцца імёны сямі народжаных да 1680 г. дзяцей, трое з якіх ужо паспелі на той момант памерці. Асабліва цікавымі падаюцца зробленыя акцэнты. Пра двух дачок Сабескага занатаваныя не толькі даты нараджэння, але імёны хросных і ў чый гонар яны былі названыя. Так Луіза-Адэлаіда-Тэафілія была ахрышчана ў 1676 г. "*біскупам Марсэля і французскім амбасадарам у гонар Караля ... і ў гонар прынцэсы Баварыі.*" І Тэрэза-Шарлота-Казіміра ахрышчаная ў тым самым годзе ў гонар караля Англіі і французскай каралевы. Адметна, што прыгаданы біскуп Марсэля, Туссэн дэ Форбен-Жансон, сапраўды быў сярод вельмі ўплывовых дыпламатаў свайго часу. Ён прадстаўляў інтарэсы Людовіка XIV у 1673 г. на элекцыі караля ў Рэчы Паспалітай і падтрымліваў кандыдатуру Яна Сабекага, а пазней яшчэ не аднойчы ўдзельнічаў у палітычных інтрыгах ва Ўсходняй і Цэнтральнай Еўропе.

У другой главе ўвага аўтара пераходзіць ад каралеўскай сям'і на эліту дзяржавы. Пакідаючы ў баку пералік усіх сенатараў Рэчы Паспалітай, затрымаемся на прадстаўніках ВКЛ. *"Віленскі біскуп Мікалай-Стэфан Пац быў абвешчаны епіскапам у Рыме 11 сакавіка 1678 г.",* а таксама Смаленскім біскуп – Казімір Пац і, трэці, Жамойцкі епіскап, чыё імя нават не прыводзіцца (пазначаны як "N"). Дэфакта, пасаду Смаленскага ў 1664–67 гг. і Жамойцкага біскупа ў 1668–95 гг. займаў адін і той жа дзеяч каталіцкага касцёлу ВКЛ, Казімір Пац [5, с. 141]. Сапраўды, кніга П'ера Сцэвола дэ Сэнт-Март зафіксавала эпоху найвялікшага ўздыму ўплыву ў ВКЛ сям'і Пацаў, калі прадстаўнікі роду займалі амаль усе вышэйшыя пасады ў дзяржаве і "*фактычна кіравала ВКЛ*" [6, с. 422]. Праўда, неўзабаве, іх месца заняў не менш значны і вядомы дом Сапег і распачаўся наступны акт барацьбы магнацкіх груповак.

Трэцяя глава скіроўвае ўвагу на эліту дзяржавы на ўзроўні ваяводстваў. І зноў нам сустракаецца прадстаўнік сям'і Пацаў – вялікі гетман Літоўскі і заадно віленскі ваявода ў 1669–1682 гг.: *"Міхаіл Пац, ваявода Віленскага ваяводства, найпрыгажэйшага ў Польшчы".* Не прамінулі тут увагай і Віленскага кашталяна – Андрэя Францішка Катовіча. Цікава, што толькі адно Віленскае ваяводства атрымала ад аўтара адносна поўнае апісанне і пазітыўную характарыстыку, іншыя ваяводствы ВКЛ апісаны без асаблівай увагі і эпітэтаў: Трокскае з ваяводам Агінскім (без імя), Полацкае з Сапегам (без імя); а Віцебскае, Мінскае і Берасцейскае зуім без прозвішчаў ваяводаў (!).

Чацвёртая глава знаёміць французскага аматара палітычнай сітуацыі ў Рэчы Паспалітай з элітай, якая займае вышэйшыя пасады. Бадай толькі зараз аўтар відавочна праводзіць падзел паміж ВКЛ і Каронай. Тут мы сустракаем зноў Міхаіла Паца, вялікага гетмана ВКЛ з 1676 г., сенатара дзяржавы – канцлера ВКЛ Крыштафа Жыгімонта Паца (кажуць, па яго ініцыятыве і яго намаганнямі кожны трэці сойм пачаў збірацца ў Гародні). Падканцлер і маршалак дворны таго перыяду Міхаіл Казімір Радзівіл *"князь на Альцы і Нясвіжы, сенатар каралеўства ... Польскі Караль яму шурын*". І завяршаў гэты спіс падскарбі ВКЛ – Бенядзікт Павел Сапега. Пра падскарбія варта дадаць, што Пацы абвінавачвалі яго ў атрыманні хабару ад французаў і нават давялі справу да суда.

Пятая глава прысвечана буйнейшым шляхецкім родам дзяржавы, дзе прадказальна мільгаюць ужо нам знаёмыя прозвішчы, але, падкрэслім, далёка не ўсе. Найбольшую частку

Репозиторий ВГУ

пераліку займаюць уладанні Радзівілаў (Бар на Падоллі, Біржы, Дубінкі, Нясвіж у Літве, Алыка на Валыні). Астатні пералік згадвае фамільныя ардынацыі Карыбутаў, Вішнявецкіх, Любамірскіх, Замойскіх і некаторых іншых родаў. Ні Пацаў, ні Сапег, ні Агінскіх тут няма! Складаецца ўражанне, што французскаму гістарыёграфу катэгарычна бракавала інфармацыі на гэты конт. І ў завяршэнні нарысу пра Рэч Паспалітую ён сам фактычна прызнаецца ў праблемах з падрыхтоўкай тэкста. *"Я пакрыўджу польскі набілітэт, але іх прозвішчы так цяжка чытаць і вымаўляць, што гэта прынясе чытачу больш пакут чым задавальнення. Калі нехта ўсё ж знойдзецца каб гэтым заняцца, ён можа звярнуцца да кнігі, якая мае назву Orbis Polonus, дзе ён знойдзе не толькі іх імёны, але яшчэ і гербы, самыя дзіўныя з тых, што існуюць у Еўропе"* [2, с. 556].

Такое рэзюмэ французскага гісторыка можна разглядаць як своеасаблівую спасылку на крыніцы, якімі карыстаўся ён сам. Кніга "*Orbis Polonus"* ("*Польскі свет*") была дасяжнай еўрапейскаму чытачу дзякуючы лацінскай мове напісання [3]. Яе аўтарам быў манах-дамініканін з Камянца-Падольскага Сымон Акольскі. Кніга выйшла ў трох частках у пачатку 1640-х гг. і мела вялікую папулярнасць як даведнік па геральдыцы і родавай гісторыі. Відавочна, П'ер Гошэ дэ Сэнт-Март, які сам паходзіў з сям'і гісторыкаў і даследчыкаў генеалогіі не мог яе абмінуць увагай.

У другой палове XVII у Францыі адбываўся сапраўдны прарыў у навуцы і асвеце. Вучоныя мужы займаліся даследаваннямі Еўропы і Свету, не абыходзячы ўвагай і нашу Бацькаўшчыну. Доказам таму з'яўляецца прааналізаваны твор прыдворнага гістарыёграфа. Ён дазваляе нам зразумець, які ўзровень ведаў і якое спецыфічнае ўяўленне аб нашай тагачаснай дзяржаве і яе эліце мела французская цікаўная публіка ў 1680-я гг.

1. Histoire généalogique de la maison de La Trémoïlle. Justifiées par chartes d'églises, arrêts du parlement, titres du trésor des chartes. Paris, Simeon Piget, 1668. – 348 p.
2. L'Estat de la cour des roys de l'Europe, où l'on voit les noms, surnoms, qualitez, armes, alliances et posteritez des roys et princes souverains.../ par M. de Sainte-Marthe,.. Paris: T. Girard , 1680 – 615 p.
3. Orbis Polonus : splendoribus caeli: triumphis mundi: pulchritudine animantium: decore aquatilium: naturae excellentia reptilium : [у 3 т.] / Simone Okolski. – Cracoviae : in Officina Typographica Francisci Caesarij, 1641–1645.
4. Урачыстая перадача У.Ліхадзедавым Нацыянальнай бібіліятэцы Беларусі рэдкіх выданняў // – Рэжым доступу: http://mininform.gov.by/news/all/urachystaya-peradacha-u-likhadzedavym-natsyyanalnay-bibiliyatetsy-belarusi-redkikh-vydannya/ – Дата доступу: 04.03.2019.
5. Wolff, J. Pacowie: materyjały historyczno-genealogiczne / J. Wolff. – Petersburg : w drukarni F.Suszczynskego, 1885. – 374 s.
6. Грыцкевіч, А. Пацы // Вялікае княства Літоўскае. Энцыклапедыя. Т. 1–3. Мінск: БелЭн, 2005 – 2010. – Т. II. – С. 422–424.

Стройлова Е.С.

КНИЖНЫЕ СОБРАНИЯ ВОСТОЧНОЕВРОПЕЙСКИХ УНИВЕРСИТЕТОВ XVII–XVIII ВВ. КАК ИСТОЧНИК ПО ИСТОРИИ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ ЖИЗНИ РЕГИОНА

Говорить об истории интеллектуальной жизни Восточной Европы в XVII–XVIII вв. невозможно без рассмотрения темы библиотечных собраний высших учебных заведениях данного региона. Целью статьи является выявление значимости библиотечных собраний в истории развития системы образования и интеллектуальной жизни общества. Нами был проведен аналитический обзор систематических каталогов высших учебных заведений, расположенных в XVII–XVIII вв. на территории Речи Посполитой и Московского государства.

К XVII–XVIII вв. в восточноевропейском регионе сформировалась единая система высших учебных заведений, которые стали важными центрами просвещения. Например, Виленская академия играла значимую роль в формировании и развитии образования на территории Беларуси и Литвы, содействуя упрочению в данных землях католицизма. Приведем лишь некоторые цитаты современных исследователей. Белорусский ученый А.В. Шаршунов пишет про Виленскую академию: «Роль Виленского университета, его предшественника – Виленской академии […], продолживших традиции университета после его закрытия в 1832 г. (просуществовавших до 1842 г.), в развитии науки и образования России, особенно ее западных губерний (в том числе Польши и Беларуси), явно принижена. Это произошло в силу проводимой в то время в доре-

Репозиторий ВГУ